гэты год ў табліцы «Асноўныя гістарычныя даты». Хто можа патлумачыць, як вызначыць, да якога стагоддзя адносіцца гэтая дата? *(1 ст. = 100 г., 8 ст. = 800 г., пачалося новае стагоддзе, але яшчэ не закончылася, прайшло 62 гады, значыць 862 г. адносіцца да 9 ст.)*

— 9 стагоддзе — дата яшчэ адной значнай гістарычная падзеі — узнікненне першай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. Прапаную, выкарыстоўваючы «Гістарычны слоўнік» і табліцу «Асноўныя гістарычныя даты», папрацаваць у пары над адказам на пытанні: што ўяўляе сабой дзяржава? як называлася першая дзяржава на тэрыторыі Беларусі?

Пасля парнай работы праводзіцца гутарка па прапанаваных пытаннях, у ходзе якой звяртаецца ўвага на назву сучаснай дзяржавы — Рэспубліка Беларусь.

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

Спачатку для замацавання ведаў аб стужцы часу і правілах лічэння гадоў у гісторыі арганізуецца самастойная работа па выкананні заданняў на с. 14–15 у рабочым сшытку з узаемаправеркай у парах.

Далей з мэтай павышэння ўзроўню асэнсавання вывучанага матэрыялу і фарміравання пазнавальнага інтарэсу прапануюцца задачы на лічэнне гадоў з дапамогай стужкі часу. Для рашэння задач выкарыстоўваецца размешчаная на дошцы стужка часу і стужкі часу ў сшытках.

Задачы на лічэнне гадоў.

а) Абазначце на стужцы часу дату заснавання горада Мінска — 1067 г. Колькі стагоддзяў паміж датамі заснавання горада Полацка і горада Мінска? (Звесткі пра горад Мінск могуць быць заменены звесткамі пра населены пункт сваёй мясцовасці.)

б) Першыя вядомыя стаянкі старажытных людзей на тэрыторыі нашай краіны з'явіліся 35 тысяч гадоў таму. А колькі гадоў аддзяляюць гэту падзею ад першага года да нашай эры? *(33 тысячы гадоў.)*

— З дапамогай стужкі часу можна паспрабаваць дома самастойна рашыць задачу на лічэнне гадоў, якая змешчана ў апавяданні «Калі пачалася наша эра?» у кнізе для чытання «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь. 4 клас» Г. У. Трафімавай, С. А. Трафімава. Можаце прыдумаць свае задачы на лічэнне гадоў і прапанаваць іх аднакласнікам.

**VI. Вынік урока.**

— Які матэрыял выклікаў асаблівую цікавасць?

— Закончыце наступнае выказванне: «Я лічу неабходным запомніць...»

— Пра што па гэтай тэме хацелася б вам яшчэ даведацца? *(Прыкладны адказ: рымскія лічбы і інш.)*

**VII. Рэфлексія.**

— Пры вывучэнні якіх прадметаў можа быць выкарыстана стужка часу? *(Літаратура — жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, геаграфія — гады геаграфічных адкрыццяў.)* Паразважайце, ці можа спатрэбіцца стужка часу ў асабістым жыцці?

**VIII. Інфармаванне аб дамашнім заданні.**

Вучэбны дапаможнік, с. 24–27, с. 27, з. 2.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

*Трафімава, Г. У.* Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь. 4 клас : кніга для чытання / Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў. — Мінск : Аверсэв, 2019.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Стадыён*

*1. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова.*

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | 5 | 1 | 6 | 4 | 7 | 2 |
| а | ы | с | ё | д | н | т |

*Падзяліце яго рыскамі (|) на склады.*

*2. Зафарбуйце слова, запісанае па-беларуску.*

стадион стадыён

*Абвядзіце алоўкам словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове.*

*3. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

іо ыё

стад..н

*4. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*




*Запішыце слоўнікавае слова, падзяляючы яго для пераносу рознымі спосабамі.*

*5. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Спартыўны комплекс з футбольным полем, пляцоўкамі для спаборніцтваў і трэніровак, трыбунамі для гледачоў — гэта ______________.

*6. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам. Закрэсліце ў дужках непатрэбную літару.*

**Чэмпіён**

Як прачнецца
(Р/р)адзівон,
дык хутчэй
на ___________.

Не прысядзе,
вечна ў руху,
крос бяжыць ён —
круг за кругам.

Разумее,
трэніроўка
зробіць дужым,
зробіць лоўкім.

Б’е рэкорды
(Р/р)адзівон,
сярод нас ён —
чэмпіён.

*Таццяна Мушынская* [1, с. 18]

*Хто такі чэмпіён? Што робіць Радзівон для таго, каб быць чэмпіёнам?*

*7. Прачытайце сказ. Дапішыце прапушчаныя літары ў слоўнікавыя словы.*

Галоўная спартыўная арэна Р__спублікі Б__ларусь — Нацыянальны Алімпійскі стад__н «Дынама».

### *Экскурсія*

*1. Злучыце склады так, каб атрымалася слоўнікавае слова.*

кскур   я   сі   э

*Зафарбуйце ў слоўнікавым слове націскны склад.*

*2. Зафарбуйце слова, запісанае па-беларуску.*

экскурсія   экскурсия

*Падкрэсліце ў словах літары, якія па-рознаму пішуцца ў рускай і беларускай мовах.*

*3. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

| | |
|---|---|
| Наведванне чаго-небудзь, паездка, прагулка куды-небудзь з пэўнай мэтай — гэта _________. Удзельнік экскурсіі — гэта ______. Асоба, якая паказвае выстаўленыя для агляду экспанаты і суправаджае паказ неабходнымі тлумачэннямі, — гэта _________. | *экскурсавод*<br>*экскурсія*<br>*экскурсант* |

*4. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Наш клас быў на ______________ ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

*5. Да слоў з правага слупка падбярыце словы з левага слупка. Злучыце словы паміж сабой.*

| | |
|---|---|
| экскурсійнае | экскурсавод |
| цікавая | бюро |
| вядомы | сезон |
| экскурсійны | экскурсія |

*6. Дапоўніце першую старонку рэкламнага буклета патрэбным слоўнікавым словам.*

Паважаныя сябры!

Запрашаем падарожнічаць!

Цікавыя ______________ па Беларусі!

Тэлефануйце па нумары 1234567.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вясёлка. — 2011. — № 7. — С. 18.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://simptomy-vs-lechenie.ru/wp-content/uploads/2018/05/vred-duni-dlya-beremennuh.jpg; http://900igr.net/up/datai/101525/0005-006-.jpg.